ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

АРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 31 (760) ● Серада, 5 лістапада ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXII

**ЮНАКІ І ДЗЯЎЧАТЫ! НАСТОЙЛІВА АВАЛОДВАЙЦЕ МАРКСІСЦКА-ЛЕНІНСКАЙ ТЭОРЫЯЙ, ВЫШЫНЯМІ НАВУКІ І ТЭХНІКІ! БУДЗЬЦЕ ВЕРНЫМІ РЭВАЛЮЦЫЙНЫМ ІДЭАЛАМ, АКТЫЎНЫМІ БУДАЎНІКАМІ КАМУНІЗМА!**

*(З Заклікаў ЦК КПСС).*

## НАШ КАСТРЫЧНІК

Віктар ШЫМУК

*Гэтак шчыра*
*І гэтак прывычна*
*Сустракаем мы свята*
*Кастрычніка.*

*Сустракаем*
*Рупліваю працай:*
*Глянь—пад хмары*
*Узняліся палацы.*

*Глянь — агні,*
*Нібы зоркі, з вакон...*
*Глянь—рунеюць*
*Палі навакол.*

*Сустракаем*
*Свае мы свята*
*Новым подзвігам*
*Касманаўтаў,*

*Новай фабрыкай*
*І заводам,*
*Новай песняй*
*Аб шчасці народным.*

*Наша свята*
*Ідзе па плошчах*
*І на ветры*
*Сцягі палошча.*

*У кожны дом*
*І ў кожную хату*
*Завітала*
*Кастрычніка свята.*

*Крочыць свята*
*Па ўсёй планеце,*
*Сее праўду*
*Па белым свеце.*

*Праз вякі*
*І праз тысячагоддзі*
*Будзе к людзям*
*Кастрычнік прыходзіць.*

*З пакалення*
*У пакаленне*
*Паўтараць будуць людзі:*
*— ЛЕНІН.*





## ВОСЕНЬ СВЯТОЧНАЯ

Кожны год восень радуе савецкіх людзей вялікім усенародным святам. Дзень нараджэння Савецкай дзяржавы — гэта агляд поспехаў і дасягненняў, дэманстрацыя адзінства і згуртаванасці, гарачага імкнення рабочых і калгаснікаў, шматлікага атрада інтэлігенцыі памножыць багацце і славу Радзімы.

Як толькі ў святочнае ўбранне апранаецца горад, радасны настрой ужо не пакідае мінчан. Ён пануе і ва універсітэцкіх карпусах і ў студэнцкіх інтэрнатах. Нібы новыя сілы ўліваюцца ў кожнага і паскараюць тэмп жыцця.

Застаецца ззаду палова вучэбнага семестра. Больш напружанымі сталі заняткі: прыбавілася семінараў, лабараторных работ. Спрабуюць свае сілы ў ролі настаўнікаў студэнты-практыканты. Маладыя даследчыкі рыхтуюцца прыняць удзел у традыцыйным аглядзе навуковых работ, прысвечаным 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна.

Вучоныя малодшага і старэйшага пакаленняў падводзяць вынікі сваёй працы, прадстаўляюць да абароны кандыдацкія і доктарскія дысертацыі, выдаюць новыя кнігі і вучэбныя дапаможнікі.

На юрыдычным факультэце закончыў вялікі аб'ём даследаванняў і прадставіў да абароны доктарскую дысертацыю загадчык кафедры крымінальнага права І. С. Цішкевіч. Святочныя падарункі паднеслі сваім факультэтам і універсітэту ст. выкладчык кафедры ядзернай фізікі У. Р. Барышэўскі, які падрыхтаваў доктарскую дысертацыю, а таксама галоўны інжынер праблемнай лабараторыі Д. С. Даманеўскі, ст. выкладчык кафедры агульнай фізікі В. М. Ткачэнка, ст. інжынер кафедры электрафізікі Б. Ю. Ханох і асістэнт гэтай жа кафедры Л. Ф. Корзун, галоўны інжынер лабараторыі кафедры ядзернай фізікі В. Т. Андрыянаў, выкладчыкі кафедры навуковага камунізма А. М. Камароў і М. П. Квочкін, якія прадставілі да абароны кандыдацкія дысертацыі.

Свае імяніннікі на хімічным і матэматычным факультэтах — гэта асістэнты кафедры аналітычнай хіміі Т. Б. Бабаеўская і Р. Г. Гручанкоў, асістэнт кафедры неарганічнай хіміі А. І. Леснікові, старшы выкладчык кафедры тэорыі функцый і функцыянальнага аналізу Ю. І. Макавоз і асістэнт кафедры матаналізу Л. П. Прымачук. Яны таксама завяршылі работу над кандыдацкімі дысертацыямі.

Плён працы нашага цудоўнага калектыву — дастойны падарунак 52-й гадавіне Кастрычніка і Ленінскаму юбілею.

Святочныя дні ва універсітэце будуць адзначаны вялікімі ўрачыстасцямі. На факультэтах адбудуцца цікавыя вечары. Студэнты запрашаюць да сябе ў госці ўдзельнікаў рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, герояў працы. Для іх, для выкладчыкаў, для сваіх таварышаў рыхтуюць выступленні самадзейныя артысты.

Са святам, дарагія сябры! Вялікай вам радасці і натхнення!

## ВЫНІКІ ПАДВЕДЗЕНЫ

У апошні дзень кастрычніка адбылася справаздачна-выбарная прафсаюзная канферэнцыя выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта. У дакладзе старшыня мясцкома дацэнт А. А. Галаўко расказаў аб асноўных напрамках дзейнасці арганізацыі і выніках работы камісій мясцовага камітэта.

З удзячнасцю названы імёны тых, хто быў сярод актывістаў. Гэта тт. Жмойдзяк, Сімакоў, Юззафовіч, Кавалёў, Гусакова і многія іншыя.

*ДА 50-ГОДДЗЯ УНІВЕРСІТЭТА*

## Юбілейнае выданне

Гісторыя нашага універсітэта — роданачальніка беларускіх вышэйшых навучальных устаноў—не толькі цікавая, але і выдатная старонка ў летапісе рэспублікі. Таму вырашана да дня святкавання 50-годдзя БДУ падрыхтаваць кнігу «Беларускі універсітэт 1921—1971 гг.».

Створана і прыступіла да работы спецыяльная рэдакцыйная калегія. Як паведаміў галоўны рэдактар юбілейнага выдання дацэнт Анатолій Іосіфавіч Кажушкоў, ужо сабраны асноўныя матэрыялы, якія расказваюць аб нараджэнні універсітэта і яго факультэтаў, умацаванні і развіцці матэрыяльнай базы, росце навуковых сіл і перспектывах старэйшай вну рэспублікі.

Асобныя старонкі кнігі «Беларускі універсітэт» прысвячаюцца стваральнікам БДУ і яго выхаванцам, тым выдатным вучоным, настаўнікам, пісьменнікам, грамадскім дзеячам, што закладвалі фундамент вышэйшай асветы на зямлі Савецкай Беларусі, ліквідавалі непісьменнасць, рухалі наперад навуку і культуру.

Перад чытачамі адкрыюцца дзверы універсітэцкіх лабараторый і кабінетаў вучоных, і ва ўсёй велічы паўстане плён працы за 50 год пакаленняў фізікаў і філолагаў, біёлагаў і гісторыкаў, прадстаўнікоў розных галін навукі і нават такіх, якіх дарэвалюцыйная Беларусь не ведала.

Юбілейнае выданне будзе добрым падарункам да 50-годдзя універсітэта.

А. АЛЯКСЕЕВА.

## ХТО Ў ЦЕРАМЕ ЖЫВЕ?

Дух вялікага перасялення пануе на хімфаку. Студэнты і выкладчыкі атрымалі цудоўны падарунак—новы, светлы, прыгожы будынак хімічнага корпуса. І цяпер студэнты клапатліва абсталёўваюць яго. Дзяўчаты пераносяць скрынкі з рэактывамі, розны хімічны посуд. Хлопцы устанаўліваюць больш цяжкія прыборы і апараты.

Я добра пазайздросціў хімікам і вырашыў пазнаёміцца з тымі, хто стаў гаспадаром цудоўных лабараторый.

— У нас нямала студэнтаў, якімі ганарыцца факультэт, — расказвае сакратар камсамольскай арганізацыі Анатоль Волкаў. — Гэта людзі, улюбёныя ў хімію, і ні на што яе не памяняюць. Ёсць, канешне, і такія, у каго справы вучэбныя не вельмі ладзяцца, але мы стараемся падцягнуць іх: дапамагаем, тлумачым незразумелыя пытанні. Ды вось пагавары з другакурснікамі Сашам Рагойшам і Людмілай Голубевай. Абодва яны добра вучацца. У Люды ёсць чацвёркі, а Аляксандр наогул вучыцца толькі на выдатна. Саша і Люда — члены камітэта камсамола хімфака. Саша — намеснік сакратара па вучэбнай і навуковай рабоце, Люда вядзе ідэалагічны сектар.

На маё галоўнае пытанне аб вучобе Саша адказаў:

— З першых жа дзён прывучаў сябе да сістэматычнай працы. Амаль кожны дзень хадзіў у бібліятэку, многа чытаў, канспектаваў. Але асноўнае —быць уважлівым, не прапускаць ніводнай лекцыі, бо ніякі падручнік не расскажа тое, што нам дае выкладчык. Не трэба таксама расслабляцца, адкладваць усё на апошнія дні перад сесіяй—і ўсё будзе ў парадку.

— Вельмі важна ўмець размяркоўваць свой час, — дадае Люда. — Кожны павінен ведаць, што будзе рабіць зараз. Інакш на адну справу патраціш некалькі гадзін, а на іншыя не хопіць часу. Так утвараюцца «хвасты». А пры жаданні кожны можа вучыцца добра.

Але ўсё ж галоўнае — улюбёнасць у свой прадмет. Тут Аляксандр і Люда былі аднадушнымі.

Цікава, што тыя, хто добра вучыцца, паспяваюць усюды. Люда, напрыклад, любіць спорт. Яна ўдзельніца турысцкіх злётаў. Аляксандр захапляецца тэатрам, эстрадай. Летам ён працаваў у будаўнічым атрадзе, а затым на будаўніцтве новага корпуса, і цяпер ён вельмі задаволен, што часцінка яго працы ўкладзена ў гэты цудоўны будынак.

Так, пазнаёміўшыся з хімікамі, я пераканаўся, што на падарунак Радзімы яны адкажуць добрымі справамі.

М. МЯТЛА, студэнт.



Фота Д. Прэса.

## ГЭТЫ ЦУДОЎНЫ СВЕТ ТАНЦА

Гучыць мелодыя Мінскага вальса, і пара за парай плаўна кружыцца па сцэне. Я назіраю за Людай Грышчанка і адзначаю ў яе лёгкіх рухах здзіўляючую натуральнасць і нават нешта велічнае. А гэтая ж лёгкасць і грацыя даліся ёй не так проста.

Свой артыстычны шлях Люда Грышчанка пачынала ў ансамблі песні і танца Мінскага палаца піянераў. Пад уздзеяннем брата, саліста балета, яна трэцякласніцай упершыню перaступіла парог палаца.

Нялёгка было авалодаць майстэрствам танца. Гэта патрабавала шмат часу, працы, вытрымкі. І так год за годам. Люда добра вучыцца ў школе, захапляецца хіміяй, гісторыяй, удзельнічае ў школьных алімпіядах і не пакідае ансамбль. Усё часцей дзяўчына задумваецца аб сваёй будучай прафесіі. Хімія ці гісторыя? Гэтае пытанне доўга мучыць яе. Хімія вабіць Люду цікавымі вопытамі, але ў той жа час уладарна захапляюць гістарычныя раманы. У гэтым паядынку перамога аказалася на баку гісторыі. Чатырнаццаць балаў з пятнаццаці магчымых далі Людзе Грышчанка права ўключыцца ў студэнцкае жыццё. Яна актыўна ўдзельнічае ў грамадскай рабоце курса і адразу ж становіцца членам універсітэцкага танцавальнага калектыву. Але шкада было развітвацца з ансамблем танца Палаца піянераў, і Люда з вялікай цяжкасцю сумяшчае вучобу і заняткі адразу ў двух самадзейных калектывах. Гэта не магло не адбіцца на вучобе.

— Калі ў першай сесіі атрымала тройку, — гаворыць Люда, — хацела нават кінуць вучобу.

З Палацам піянераў давялося развітацца. Люда сур'ёзна бярэцца за вучобу. Раз у тыдзень наведвае рэпетыцыі, строга плануе свой дзень. Вынікі былі прыкметнымі: трэці курс яна скончыла на добра і выдатна. Вучоба і рэпетыцыі не перашкаджаюць цяпер адно аднаму.

Разам з ансамблем «Крыжачок» Люда пабывала ў Казані, Вільнюсе, Тарту і іншых гарадах.

— Нашы выступленні заўсёды праходзяць з вялікім поспехам, — расказвае Люда. — І гэта можа таму, што ансамблем кіруе Мікалай Вікенцьевіч Лапша. Вось і зараз мы выязджаем з канцэртам у ГДР. Спадзяюся, што выступім паспяхова.

Я таксама спадзяюся на гэта і жадаю Людміле і яе сябрам паспяховых гастроляў у ГДР.

В. РАДКЕВІЧ, студэнтка.

## УЗНАГАРОДА — НЕВЯДОМЫЯ

Невядомую старонку з жыцця і рэвалюцыйнай дзейнасці вядомага савецкага філосафа Уладзіміра Мікалаевіча Іваноўскага (1867—1939 гг.), які ў 1921—1927 гадах працаваў у Беларускім дзяржаўным універсітэце, давялося прачытаць студэнту філасофскага аддзялення гістарычнага факультэта БДУ Г. Г. Іваноўскаму. Рыхтуючы ў навуковым гуртку даклад аб тэарэтычнай спадчыне прафесара, студэнт знайшоў у архівах Мінска шэраг каштоўных дакументаў, якія, аднак, патрабавалі ўдакладнення. Пачаліся пошукі тых, хто слухаў лекцыі У. М. Іваноўската, працаваў з ім. І хоць пошукі працягваліся больш года, нарэшце яны прынеслі шмат радасці даследчыку.

У Маскве жывуць дочкі Уладзіміра Мікалаевіча Алена Уладзіміраўна і Таццяна Уладзіміраўна, якія поўнасцю захавалі архіў бацькі. З імі нашага студэнта пазнаёміў прафесар Б. Э. Быхоўскі — вучань У. М. Іваноўскага і яго калега па Беларускаму універсітэту.

Аказалася, што У. М. Іваноўскі вельмі рана уступіў на шлях барацьбы з царскім самадзяржаўем і ўступіў на яго як рэвалюцыйны паэт. Займаючыся ў Маскоўскім універсітэце, ён удзельнічаў у студэнцкім руху, хадзіў з сябрамі на заводы да рабочых. 12 студзеня 1898 года—у «Таццянін дзень»—на студэнцкай сходцы Уладзімір Мікалаевіч выступіў з пранікнёнай прамовай, якую закончыў заклікам мацаваць саюз навукі з народнымі масамі. Выступленне спадабалася прысутным, а універсітэцкі таварыш М. Н. Пакроўскі сур'ёзна параіў напісаць на гэтую тэму вершы.

— Гэта патрэбна, і ў цябе абавязкова атрымаецца, — заявіў будучы гісторык-марксіст.

Вершы пайшлі па руках. Аб іх гаварылі з пахвалой. Сам Уладзімір Мікалаевіч пазней не вельмі высока ацэньваў іх. У сваёй біяграфіі ён пісаў, што тады яшчэ «зыходзіў не столькі з партыйных, спецыфічна пралетарскіх пазіцый, колькі з адцягненых ідэй сацыяльнай справядлівасці, сацыяльнага міру. У гэтым слабасць маёй пазіцыі — у ёй было занадта многа рэшткаў інтэлігенцкага гуманізму; аказалася, што мала было пазнаёміцца з ідэямі сацыялізма, пранікнуцца сімпатыямі да народа, трэба было яшчэ глыбока прыраўняць сябе да гэтых працоўных. Гэтага тады я не мог зрабіць».

Зрабіць гэта дапамаглі не вершы, хоць і пранікнутыя пафасам рэвалюцыйнай барацьбы, а знаёмства з марксізмам. Ён праштудзіраваў кнігу Г. В. Пляханава «Да пытання аб развіцці маністычнага погляду на гісторыю». Але асабліва вялікі ўплыў на яго аказала работа У. І. Леніна «Развіццё капіталізму ў Расіі». Прачытаўшы яе, пісаў У. М. Іваноўскі, «крытычна мыслячыя мысліцелі бляднелі, адыходзілі на задні план».

Хутка, у 1900 годзе, Уладзімір Мікалаевіч атрымлівае навуковую камандзіроўку за мяжу, і яму пашчаслівілася асабіста пазнаёміцца з аўтарам гэтай кнігі — у Парыжы ён слухаў лекцыю У. І. Леніна па аграрнаму пытанню.

Рашэнне было беспаваротным — актыўна ўключыцца ў барацьбу на баку пралетарыяту, усіх працоўных. І вось тут успомнілася першая проба пяра. Працуючы пасля вяртання на радзіму ў Казанскім універсітэце, у тым універсітэце, у якім некалі вучыўся У. І. Ленін, Уладзімір Мікалаевіч стаў, па словах прафесара А. А. Красноўскага, яго былога вучня, сябрам і таварышам рэвалюцыйнага студэнцтва. Менавіта тады ў адказ на «вялікае злачынства царызму—расстрэл рабочых у Пецярбурзе 9 студзеня 1905 года» ён адклікнуўся новым вершам, поўным гневу да катаў і страснага закліку да народа скінуць ненавіснага цара і ўсіх яго прыхільнікаў.

Верш У. М. Іваноўскага «9 студзеня 1905 года» высока ацаніў пазней Аляксей Максімавіч Горкі. Ён забраў яго сабе і выказаў Уладзіміру Мікалаевічу спачуванне, што яно не было надрукавана тады, у 1905 годзе.

Так, яго не надрукавалі казанскія газеты, але, відаць, не без іх удзелу на аўтара было заведзена «Красное дело», пачаліся ганенні, а пасля ён быў увогуле пазбаўлены работы. Як і ў студэнцкія гады, стаў весці галоднае існаванне.

Вось гэты верш, копію якога ў Інстытуце сусветнай літаратуры імя Горкага ў Маскве знялі дочкі У. М. Іваноўскага і перадалі нашаму студэнту. Яно публікуецца ўпершыню.

Мы обнищали. Царь, мы бездольны,
Жалкие тени, не люди мы,
В жизни бесправны, в счастьи не вольны,
Бьёмся с нуждою, слепнем от тьмы.
Дрогнет в нас стужа, стонет в нас голод,
Думы то меркнут, то пламенем жгут,
Сердце то стонет, то бьётся, как молот,
Тянет нам жилы наш каторжный труд.
Эй, разойдись!
Ишь, собрались!
Слева и справа!
Видишь, застава!
Ну же, назад!
Вам говорят?!
Экий народ!
Так ведь и прет...
Нет! Погоди! Еще вам ой-ой-ой горячо поддадим.
Правды мы ищем, воли и света,
Глухо стучимся в двери тюрьмы...
Нет нам ответа, нету привета,
Скот мы рабочий — не люди мы!..
Ты наша правда, свет и свобода!
Выйди к народу, нас защити!
А! Бунтовщик! На карачках пополз?..
Знай порядок — молчи!
Ужас!! Горе!.. Мщенье, братья!!
Волк под мантией царя!
Дикий зверь! Прими проклятье!
Лютой местию горя,
Кровью спаянные братья,
Вы отриньте все заклятья,
И да сгинут — без изъятья,
Царь и все, кто вкруг царя!

Казань, январь 1905.

Трэба сказаць, што А. М. Горкі даваў добры водгук аб дарэвалюцыйных артыкулах У. М. Іваноўскага аб Герцэне, Пушкіне і аб яго навуковых працах савецкага перыяду. 25 красавіка 1926 года ён пісаў аб выдадзенай у Мінску ў 1923 годзе кнізе «Метадалагічныя ўводзіны ў навуку і філасофію»: «З усіх мной прачытаных кніг рус-

# ЗАПІШЫЦЕ МЯНЕ Ў СТУДЭНТЫ

**Раніца. Мы ідзем па алеі старога сквера. Кружыцца пажоўклае лісце: восень-паэтэса дапісвае на вятрах свае апошнія «залатыя» радкі.**

**— Прывітанне! — чуюцца побач знаёмыя галасы. Вядома: сябры-сакурснікі.**

**Яшчэ зусім ясна часам акрэсліваюцца тыя жнівеньскія дні, калі кожны з нас гарэў жаданнем стаць студэнтам. Хваляванні, напружаныя гадзіны падрыхтоўкі запаўнялі тыя дні.**

**Але ж у кожнага з нас, сёння студэнта I курса факультэта журналістыкі, была і тая незвычайна шчаслівая хвіліна, якая нібы прыадкрыла занавес будучыні. У руках — выклік. Я уяўляю, якой радасцю свяціліся вочы Ірыны Гаранінай, Тамары Абрамовіч, Святланы Будзько, Мішы Дашко, Анатоля Кухарчука, Тамары Філімонавай і іншых.**

**...Прасторная аўдыторыя, сардэчныя віншаванні выкладчыкаў са званнем студэнта, першыя лекцыі... Студэнцтва...**

**Толькі знешні сэнс гэтага слова быў улоўлены за некалькі дзён першага семестра. Затое больш глыбокая, неад'емная частка гэтага сэнсу — пачуццё калектывізму — па-сапраўднаму праявілася ў працы. Прыйшлося замест шарыкавай ручкі ўзяцца за лапату, узброіцца шуфлем, адчуць далонямі прахалоду калгасных бульбяных палёў...**

**Брыгадзе юнакоў давялося працаваць на таку. Што ні кажы, а калгасная праца патрабуе поўнай фізічнай самааддачы. Горы збожжа, не кранутыя з дзён жніва, «гарэлі» ад вільгаці. Задача — як мага хутчэй выратаваць зерне. Выхад адзін— перасыпаць. Сямёра спін. Мускулы напружаны да адказу. Работа сапраўды мужчынская. «Абараняй гонар, ты ж — мужчына!» Дэвіз адзін: «Бяры пабольш, кідай чым далей».**

**Скупы на словы кладаўшчык не стрымаў задавальнення: «Малайцы, такіх яшчэ не было... каб не прагаварыцца».**

**Работа, план... Апошняга і ў думках не было.**

**I кладаўшчык не прагаварыўся. Зерне было перасыпана, да таго ж перачышчана як след.**

**Нібы зараз бачу Лёню Екеля. Быццам ля карабля ў прасоленай потам флоцкай цяльняшцы, ён арудаваў шуфлем ля веялкі, а зерне хвалямі расплёсквалася аб транспарцёр, нібы аб борт. Магчыма гэтым вобразам жыў і ён сам, былы матрос.**

**...I хоць гарэлі далоні, нылі спіны, на валейбольнай пляцоўцы, што амаль зарасла травой, да самага вечара не сціхалі ўдары па мячу, гоман, смех. Саша Бушэнка, Васіль Драгавец, Дзіма Дзякаў перайшлі з «атакі ў атаку». Увесь дзень «націскалі» на бульбу, а тут—на «праціўніка».**

**Не здавалі ў працы і дзяўчаты. Забываліся на касметыку, але, загарэлыя пад вераснёўскім сонцам, здаваліся багінямі...**

**Незабыўна прайшлі дні працы — дні нашага сапраўднага знаёмства паміж сабой, дні, якія згуртавалі курс у баявы калектыў. Я не выпадкова кажу «баявы». Так было і ёсць на самай справе. З першых дзён заняткаў першакурснікі сталі актыўнымі памочнікамі сваіх старэйшых сяброў. Супрацоўнічаюць ва універсітэцкім друку, не без іх актыўнага ўдзелу праходзяць камсамольскія і прафсаюзныя сходы. Але наперадзе — сесія. Першая ў жыцці. Гэта абавязвае гадзінамі праседжваць у бібліятэках, прымаць удзел у гуртках, сістэматычна наведваць заняткі.**

**...Будні, будні. Яны ўжо для нас студэнцкія. А былі для кожнага розныя. I рэдакцыйныя: шмат на курсе тых, хто вырашыў павысіць кваліфікацыю газетчыка; і працоўныя: многія ўжо настаўнічалі, працавалі на заводах, будоўлях. А ёсць і такія, чыё месца не астыла за школьнай партай.**

**Мне хочацца пажадаць сваім сакурснікам будняў сапраўды студэнцкіх, а гэта значыць і працоўных, і рэдакцыйных.**

**В. ДРАНЧУК,**
**студэнт 1 курса журфака.**



*Рэвалюцыйная гісторыя нашай Радзімы заўсёды выклікае жывую зацікаўленасць моладзі. Дзе б ні пабывалі студэнты універсітэта з экскурсіяй, яны абавязкова наведваюць месцы, звязаныя з рэвалюцыйнымі падзеямі, з імем стваральніка Савецкай дзяржавы Уладзіміра Ільіча Леніна.*

*НА ЗДЫМКУ: у Музеі рэвалюцыі ў Ленінградзе.*
*Фота Д. ПРЭСА.*

# Шукальнікі прыгод

Дабірацца да месца традыцыйнага, X злёту на гэты раз было не так лёгка— ад станцыі Гарадзішча да лагера кіламетры чатыры. I не адна група, перш чым выйсці да вясёлых яркіх кастроў, блукаючы па начным лесе, трапляла ў балотца ля ракі Вілмы.

Каб навічкі не раздумвалі, куды ім звяртацца наконт палаткі і спальнікаў, таблічка з надпісам «Камендант» красавалася прама на спіне Лёні Вараб'ёва. А ён, здавалася, адначасова быў ва ўсіх канцах лагера: многа клопатаў у каменданта. Але вось ужо ўсё наладжана. Вячэра гатова, і групы пачынаюць сцякацца да вялікага агульнага кастра паслухаць і самім паспяваць сумныя і задорныя турысцкія песні.

Апоўначы сабраліся ўдзельнікі начнога арыентавання. Некаторыя раз-пораз аглядваюцца на лес, бо яшчэ за тыдзень да злёту па універсітэту хадзілі чуткі аб тым, што арыенціроўшчыкаў чакаюць сюрпрызы тыпу вампіраў, лесуноў і русалак. Абставіны не разраджае і хор прывідаў. Расказы ж аб тым, што было на дыстанцыі, да гэтай пары папулярныя. Прывіды ў белым, блукаючыя агеньчыкі, злавесны рогат у глушы лесу — усяго нацярпеліся ўдзельнікі спаборніцтваў. Але самае цікавае, што нарэшце амаль ці не ўсе ўдзельнікі злёту падключыліся да гэтай гульні. Прыйшлося на сабе адчуць вастрыню турысцкіх жартаў і аднаму з арганізатараў прыгод, калі на яго напалі ў лесе невядомыя.

А раніцай, пасля ўрачыстага адкрыцця злёту, пачаліся спаборніцтвы па арыентаванню на першынство факультэтаў БДУ. Наперадзе з абсалютным першынством аказалася каманда матфака. Матэматыкі А. Кузняцова і Н. Іваноў прайшлі дыстанцыю першымі.

Амаль адначасова праходзілі спаборніцтвы на паласе перашкод.

На жаль, адзін чалавек не справіўся са сваімі абавязкамі — гэта адказны за надвор'е: у сярэдзіне дня пайшоў дождж. Але і ў такіх цяжкіх умовах герaічныя павары прыгатавалі торт на конкурс «У дарозе, як дома». Першае месца заняла каманда фізікаў пад кіраўніцтвам Г. Курловіча. Яна атрымала прыз — паўсотні бенгальскіх агнёў. Самы жаданы прыз—вялікую воблу заваявалі пераможцы спаборніцтваў на паласе перашкод — слаўная тройка альпіністаў — С. Шабуня, Б. Раманаў, А. Буйко.

I хоць хлюпала вада ў бацінках і рукзак пацяжэў ад макраты, але рабяты вярталіся дамоў вясёлыя і бадзёрыя, поўныя рашучасці ў любое надвор'е зноў пайсці сустракаць світанне ля кастра.

**М. ЯУМЕНЧЫКАЎ,**
**В. ВАРАЧАЕВА,**
**члены савета турклуба.**

кіх філосафаў Ваша кніга здзівіла мяне прастатой і яснасцю мовы, а таксама і строгай паслядоўнасцю выкладання... За скупасць водгуку не наракайце і за звычайны камплімент сказанае мною не прымайце».

Аляксей Максімавіч клапаціўся аб надрукаванні іншых частак кнігі (прадугледжвалася чатыры тамы) у выдавецтве «Время», затым у Ленінградскім дзяржвыдавецтве. У другім пісьме А. М. Горкі пытаў аўтара, ці ведаюць гэтую кнігу немцы, а ў размове з У. М. Іваноўскім выказаў думку, што лічыў бы жаданым, каб гэту кнігу ведалі за мяжой.

Мяркуючы па пісьмах А. М. Горкага, а таксама па ўспамінах У. М. Іваноўскага, Аляксей Максімавіч высока цаніў «Метадалагічныя ўводзіны ў навуку і філасофію» як першую работу такога роду, але, відаць, не выпадкова не ўдаваўся ў падрабязнасці. Кніга не была пазбаўлена фактычных памылак і нават метадалагічных агрэхаў. Тлумачылася гэта тым, што ў тыя гады прафесар У. М. Іваноўскі яшчэ не змог поўнасцю вызваліцца ад уздзеяння пазітывізму. Да таго ж у Мінску ён не меў магчымасці набыць неабходную літаратуру. Дарэчы, аб гэтым гаворыцца ва ўступе самога аўтара да кнігі. Несумненна адно, і гэта даволі знамянальна, што А. М. Горкі дамагаўся развіцця навуказнаўства — той навукі, якая пачынае бурна прагрэсіраваць толькі ў нашы дні. Ён заўважыў весніка вясны — першую ластаўку—і ўсімі сіламі імкнуўся дапамагчы яе свабоднаму палёту.

Вялікую дапамогу ў Мінску, а затым у Маскве Уладзіміру Мікалаевічу Іваноўскаму аказваў А. В. Луначарскі, адабраючы яго педагагічныя пачынанні і вопыт у падрыхтоўцы навуковых кадраў (У. М. Іваноўскі першым у Казанскім універсітэце пачаў чытаць у якасці факультатыўных курсаў педагагічныя дысцыпліны: гісторыю педагогікі і цыдактыку, ён паклаў пачатак развіццю педагагічнай навукі і ў Беларускім універсітэце).

«З асаблівым густам і любоўю, — пісаў яго вучань прафесар А. А. Красноўскі ў некралогу, — падыходзіў Уладзімір Мікалаевіч да вырошчвання маладых навуковых кадраў. Добра ўсведамляючы велізарныя патрабаванні нашай Радзімы ў навуковых сілах, Уладзімір Мікалаевіч усюды знаходзіў маладых людзей, здольных пайсці па гэтаму нялёгкаму ў той час шляху. Будучы яшчэ маладым прыват-дацэнтам у Казані, ён падрыхтаваў да прафесарскага звання на сваёй кафедры трох чалавек. Гэтак жа паступаў ён і ў Самары, і ў Беларускім універсітэце. Аспіранты па іншых спецыяльнасцях знаходзілі ва Уладзіміра Мікалаевіча неабходныя даведкі па пытаннях метадалогіі навук і параду аб напрамку навукова-педагагічнай дзейнасці».

Сярод вучняў У. М. Іваноўскага такія вядомыя савецкія вучоныя, як прафесары Б. Э. Быхоўскі, А. О. Макавельскі, а таксама спецыялісты па іншых навуках — той жа А. А. Красноўскі, прафесары Л. С. Выгодскі, В. П. Волгін і іншыя.

Студэнт Г. Г. Іваноўскі знайшоў у сямейным архіве дакумент аб тым, што Уладзімір Мікалаевіч, будучы занятым ва універсітэце выкладчыцкай работай, а пасля і як намеснік рэктара па навучальнай частцы, чытаў лекцыі па метадалогіі навукі ў двух мінскіх педтэхнікумах, а на курсах беларусазнаўства — гісторыю педагогікі. Ён часта выступаў перад працоўнымі Мінска, Гомеля і іншых гарадоў па пытаннях мастацкай літаратуры, шырока прапагандаваў творчасць Пушкіна, Някрасава, Горкага... Калі ў 1927 годзе прафесар У. М. Іваноўскі цяжка захварэў і вырашыў пакінуць работу, СНК БССР устанавіў яму пажыццёвую персанальную пенсію. Смерць застала гэтага таленавітага вучонага, які ўступіў у навуку з рэвалюцыйным паэтычным сцягам у руках, калі ён працаваў над гісторыяй айчыннай псіхалогіі.

Знамянальна, што пакуль невядомую даследчыкам старонку дзейнасці прафесара У. М. Іваноўскага прачытаў студэнт — адзін з прадстаўнікоў таго пакалення, да якога са словамі прывітання і пажадання навуковых подзвігаў звяртаўся ў сваім развітальным пісьме Беларускаму універсітэту Уладзімір Мікалаевіч у кастрычніку 1927 года.

М. ІОСЬКА,
кандыдат філасофскіх навук.

# ВЕРШЫ

## ПЕРАМОЖЦЫ АСЕННІХ СТАРТАЎ

СПОРТ

**30 кастрычніка ў парку Чалюскінцаў быў праведзены лёгкаатлетычны крос на першынство студэнцкага спартыўнага таварыства «Буравеснік». Мужчыны спаборнічалі на дыстанцыі 1000 м і 3000 м, жанчыны — на дыстанцыі 500 м і 1000 м.**

**Вельмі паспяхова выступіла каманда нашых дзяўчат — Валя Бруцкая, Тамара Цімашкова (матфак), Валя Цагойка (фізфак), Іра Лешчанка (біяфак). На дыстанцыі 500 м яны занялі другое каманднае месца, прапусціўшы наперад толькі дзяўчат інстытута фізічнай культуры.**

**Гэтак жа паспяхова выступілі нашы юнакі на дыстанцыі 1000 м. Каманда ў складзе Арнольда Казачэнкі, Ігара Гуляева, Дзімы Ландо (усе з II курса фізфака) і Віктара Краснапрошына (I курс матфака) выйшла на другое месца, прапусціўшы толькі калектыў ІФК.**

**На дыстанцыі 3000 м вызначыўся сярод нашых студэнтаў Міхаіл Чабан (III курс хімфака).**

**У выніку каманда БДУ заняла агульнае другое месца, прайграўшы камандзе інстытута фізічнай культуры**

**В. ЗАРЭЦКАЯ.**

# НЯХАЙ НЕ ПАКІДАЕ НАТХНЕННЕ

Літаратурнае аб'яднанне «Узлёт» вядомае ў рэспубліцы. Яго выхаванцы рэгулярна змяшчаюць вершы ва універсітэцкай шматтыражцы, выступаюць у рэспубліканскіх маладзёжных часопісах і нават выдаюць свае зборнікі. На працягу многіх год кіруе студэнцкай паэтычнай моладдзю доктар філалагічных навук паэт Алег Антонавіч Лойка.

Давайце завітаем на чарговае пасяджэнне ўзлётаўцаў, паслухаем іх галасы.

— Вы, безумоўна, чыталі ў папярэднім нумары газеты вершы Людмілы Забалоцкай, Валянціны Хамчук, Ніны Супрун, Янкі Кібеня, — звярнуўся Алег Антонавіч да пачаткоўцаў. — Напэўна, яны вам спадабаліся. Але што скажуць аб гэтых паэтычных радках старэйшыя ўзлётаўцы — Генадзь Пашкоў, Яўген Хвалей, Іван Станкевіч, Васіль Шырко і астатнія — тыя, хто ўжо некалькі гадоў запар выступае на старонках беларускай перыёдыкі?..

— Вершы Людмілы Забалоцкай мне асабліва спадабаліся, — пачала першая Жэня Янішчыц.— Ім уласціва чысціня, лірычнасць, свежасць пачуццяў. Асабліва добры верш «Бурштын». У Янкі Кібеня сустракаюцца банальныя вобразы.

Пакрытыкавала Жэня і вершы М. Шашко і верш В. Хамчук «Не хадзі адзінокім рыцарам». Але наконт апошняга меркаванні разышліся: адны хвалілі, другія не згаджаліся. Выклікалі спрэчкі і вершы іншых аўтараў. Верш Ніны Супрун «Пачатак» спадабаўся большасці прысутных, бо, як сказаў Алег Антонавіч, гэта сам наіў, здзіўленне, першароднасць пачуцця, якая не можа не ўразіць або захапіць.

Аказваецца, акрамя ўмення пісаць, неабходна і ўменне аб'ектыўна крытыкаваць. Магчыма, няма сэнсу літаральна прыводзіць словы ўсіх выступаўшых. Было шмат заўваг і не менш карысных, добрых парад. Тут не толькі судзілі па ўсёй строгасці, але і раілі, вучылі. Вучылі цяжкаму майстэрству больш дасканала выказваць свае пачуцці, думкі. Усім было зразумела, што паэзія — гэта не толькі свет цудоўных адкрыццяў. Гэта — праца. Настойлівая, клапатлівая і цудоўная!

Калі чалавек піша вершы, кажуць, што на яго найшло натхненне, і я зноў прыпамінаю словы А. А. Лойкі, з якімі ён звярнуўся да маладых узлётаўцаў: «Пішыце. І няхай вас ніколі не пакідае натхненне!».

**Г. НАУМЧЫК,**
**студэнтка.**

# ШЧАСЛІВАГА ПАЛЁТУ!

Уласная кніжка (асабліва калі яна першая) — заўсёды свята ў жыцці паэта. Выхад першага зборніка вершаў Юркі Голуба стаў двайным святам: і для самога Юркі, і для нашага універсітэта. Не так ужо часта бывае, калі студэнт выдае кніжку.

Імя Юркі Голуба нярэдка можна сустрэць на старонках беларускай перыёдыкі. Менавіта адтуль пачыналася шырокае знаёмства чытача з маладым паэтам. Вершы, якія мы раней чыталі на старонках «Полымя», «Маладосці», «ЛІМа», зараз сабраны ў адну невялічкую кніжачку пад назвай «Гром на зялёнае голле». Трэба сказаць, што прыхільнікі паэзіі не абышлі увагай гэты зборнік. Наўрад ці ўдасца вам купіць яго ў кнігарнях ці кіёсках.

Што ж такое «Гром на зялёнае голле»? Разгорнем кніжачку. Паэт пачынае весці гутарку з чытачом:

**Зноў галубіныя веранды,**
**Дажджы святлеюць,**
**як сады.**
**Дваццаты год.**
**Ужо не рана.**
**Са мной, развага,**
**пасядзі.**
**Жыццё раскладзена**
**на трэці:**
**Адна... Яшчэ.., Яшчэ адна,**
**Хачу старонкі перытрэсці,**
**Дзе жылка кожная відна...**

Дзяцінства, юнацтва, сталасць... Паэт жыве зараз як быццам бы ў другой «трэці». Яшчэ пара юнацтва. Але, «перытрасаючы старонкі» свайго жыцця, паэт часта ў сваіх вершах вяртаецца туды, дзе нарадзіўся, успамінае бацьку... Гэтыя вершы («Дома», «Хата, якой няма», «Бацьку», «Пачатак»), як мне здаецца, асабліва дарагія і самому Юрку. У іх ён падзяліўся з намі самым запаветным. З усёй шчырасцю напісаны паэтычныя радкі, таму яны хвалююць і нас, чытачоў.

Юрка Голуб нарадзіўся пасля вайны. Ён не жыў яшчэ ў той час, калі грудзі Радзімы прастрэльваў фашысцкі кат. Усім нам, асабліва беларусам, вельмі дорага абышлася тая вайна. Пра яе і зараз напамінаюць старыя партызанскія зямлянкі, і маці, што па сённяшні дзень аплакваюць загінуўшых сваіх сыноў; маці, якія столькі год жывуць са сваёю бядою, якая «не пройдзе напралом, як той свінец праз гімнасцёрку»... Паэт звяртаецца да тэмы вайны неяк па асабліваму далікатна. У дзяцінстве мы ведалі пра яе па кнігах, кінакарцінах. Самі гулялі «ў вайну». А зараз... Зараз, пасталеўшы, мы зразумелі, якое дарагое слова «мір». Мы не хочам ведаць вайны. Але:

**Зброя не памірае**
**У руках...**
**У акопах...**
**Пад лісцем травы...**
**Зброя жыве!**
**Яна глядзіць на аблокі**
**Чорнай зрэнкай**
**Ствала.**
**Засыпае ёй вочы**
**Жвір траншэі**
**Забытай.**
**Б'ецца ў капсуль**
**патрона**
**Прамень зялёны...**
**Толькі зброя маўчыць...**
**Так і трэба.**

Гэта адзін з лепшых вершаў зборніка. Хай маўчыць зброя! Такія мары ва ўсіх сумленных людзей Зямлі.

Нельга сказаць, каб тэматыка вершаў зборніка «Гром на зялёнае голле» была вельмі разнастайнай. Агульны настрой кніжкі, на мой погляд, трошкі мінорны, хоць сустракаюцца вершы, напісаныя і з юнацкім рамантычным запалам («Нашто бясконцыя тырады...»), і са светлай усмешкай («Вясковае вяселле»). Нельга не адзначыць і верш «Грыбное свята». Здаецца, ужо столькі напісана і пра грыбы, і пра дубровы. Ну што яшчэ новага можна сказаць? Аднак жа можна! Паглядзіце і паслухайце:

**А пушча—дзеўка-**
**нечапай!**
**Таную не абломіш.**
**Гарыць у жнівеня шчака,**
**Як сонца у саломе.**
**Дыміцца сала не ў сяле,**
**А бор, што дзед, вясёлы!**
**І на паломніцкім стале —**
**І солі і да солі.**
**Апаліць чарка, як агонь,**
**Калі ў грыбное свята**
**Прыходзіць рэха: ого-го!**
**Раптоўна пушчу сватаць.**

Вельмі добры верш аб жанчынах, аб «палескіх мадонах». З любоўю і павагай пра жанчыну-маці расказвае паэт.

Было б дзіўна, калі б малады паэт не закрануў адвечную тэму лірыкі—каханне. Вершы гэтай тэмы (іх некалькі ў зборніку) не ўсе аднолькавыя па майстэрству. Лепшы з іх—«Без напамінку ты прыйдзі».

Падводзячы вынікі, скажу, што кніжка небездакорная. Не ўсе вершы ў ёй роўныя — ёсць мацнейшыя, ёсць крыху слабейшыя. Але гэта — першы крок у літаратуру.

Шчаслівага палёту, табе, Голуб Юрка!

**Ул. ВАСІЛЕВІЧ,**
студэнт I курса
аддзялення беларускай
мовы і літаратуры.

## З ПЕСНЯЙ У ГОСЦІ

**Народны ансамбль танца «Крыжачок» разам з групай ансамбля народных інструментаў выехаў у Германскую Дэмакратычную Рэспубліку. Нашы самадзейныя артысты выступяць перад студэнтамі Іенскага універсітэта, рабочымі народнага прадпрыемства «Карл Цэйс Іена», перад хлебаробамі сяла Кале, пабываюць у воінскіх падраздзяленнях, у Таварыстве германа-савецкай дружбы.**

**У цікавай і разнастайнай праграме універсітэцкага калектыву многа народных танцаў і песень як беларускіх, так і рускіх, украінскіх, малдаўскіх. Будзе паказана і харэаграфічная кампазіцыя «Камсамольцы 20-х гадоў».**

**М. БЯЛЕВІЧ.**



РАЗВІТАЛЬНАЯ КРАСА.
Фотаэцюд Л. ЦІТОВАЙ.

# ЗАПРАШАЕМ ДА ПРЫГОЖАГА

Юны сябра! Ты, безумоўна, імкнешся да ўдасканалення, хочаш кваліфікавана разважаць аб складаных творах народнага мастацтва, рускай і замежнай класікі, марыш быць знатаком мастацтва. Мы дапаможам табе ў гэтым. 11 снежня ў памяшканні тэатра оперы і балета спектаклем «Царская нявеста» Рымскага-Корсакава пачынае заняткі УНІВЕРСІТЭТ ОПЕРНАГА І БАЛЕТНАГА МАСТАЦТВА, які створан пры камітэце камсамола.

За шэсць месяцаў (снежань—май) ты зможаш наведаць шмат оперных і балетных спектакляў. Сярод іх: «Аіда» (Вердзі), «Тоска» (Пучыні), «Спартак» (Хачатурана), новы беларускі балет кампазітара Глебава (па матывах твораў Я. Купалы) «Выбранніца» і новы спектакль у рэпертуары тэатра — балет Чайкоўскага «Спячая прыгажуня».

У спектаклях прымуць удзел вядучыя салісты Акадэмічнага вялікага тэатра оперы і балета БССР народныя артысты рэспублікі В. Чарнабаеў, І. Сарокін, А. Генералаў, Н. Давыдзенка, В. Давыдаў. Выступяць і маладыя выканаўцы, якія заваявалі прызнанне не толькі ў Беларусі і ў Савецкім Саюзе, але і за мяжой. Сярод іх заслужаная артыстка БССР Святлана Данілюк, Аскольд Сухін, Людміла Бжэзоўская, Віктар Саркіс'ян і іншыя. У спектаклях прымуць удзел салісты ГАБТа, вядучых тэатраў свету.

Заняткі ва універсітэце запланаваны адзін раз у месяц (11 снежня, 8 студзеня, 12 лютага, 12 сакавіка, 9 красавіка, 14 мая) у памяшканні тэатра оперы і балета.

Перад слухачамі выступяць мастацтвазнаўцы, кампазітары, балетмайстры, вядучыя спевакі і танцоры Беларусі і Савецкага Саюза. Яны падзеляцца думкамі аб мастацтве, раскажуць слухачам аб сваіх асабістых планах, аб сучасных праблемах оперы, балета, музыкі. Цікавым будзе знаёмства са спецыфікай, гісторыяй таго ці іншага спектакля, асаблівасцямі выконваемых партый. Кожны слухач зможа прыняць удзел у абмеркаванні спектакляў. Абяцаюць быць цікавымі і творчыя сустрэчы артыстаў і студэнтаў.

Ітак, дружа, запісвайся ва універсітэт апернага і балетнага мастацтва. Не пашкадуеш!

За кароткі тэрмін ты узбагацішся цікавымі ведамі. А вялікі свет мастацтва стане для цябе пастаяннай крыніцай радасці.

Кошт абанемента ад 1 р 80 кап. да 4 р. 80 кап. Мы чакаем цябе з заявай у камітэце камсамола да 5 снежня.



Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.
АТ 18392 Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106 Т-22-07-19. Друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Зак. 1788. Тыраж 2000 экз.